ДУА “Сярэдняя школа №1
г.Сянно імя З.І.Азгура”

# Тэксты для напісання водгуку на празаічны твор (9 - 11 класы)



## Пастушок

Кастусёк зімою хадзіў у школу. Канец вясны, лета, пачатак восені—пастушок. Пасвіў свае дзве каровы і цялушку, займаў кожную раніцу—так пагадзіліся на пачатку вясны—суседавы, аж 5 штук.

І тым летам, калі пра Кастуська загаварылі сталыя, падлеткі і нават малыя, я бачыў яго кожны дзень. Быў Кастусёк—не як у ранейшыя леты—паспакайнелы, раўнейшы, пасталелы. Можа, з таго, што ўжо меў кніжкі «на шосты клас» і кожны дзень браў адну з сабою, калі гнаў статак на пашу. Паціху пагартае, малюнкі, аж прыгнуўшыся, разгледзіць, паўзіраецца ў загалоўкі, некаторыя старонкі пачытае. У Кастуська ішла, як сёння кажуць, поўным ходам падрыхтоўка да навучальнага года. А можа—іншыя прычыны. Ды што за іншыя прычыны, то ні тады іх не ведаў, ні, зразумела, цяпер, праз гады, калі пішу.

Канчаўся жнівень. Пашы і расходу яго статку пабольшала, стала менш шкоды і лягчэй пасвіць. У садках—іх мелі не ўсе вяскоўцы—паспелі яблыкі, грушы. Ужо ў самым-саменькім смаку кіяхі, ужо распузацела бручка; налілася і патаўсцела морква; была ўжо і гарбузовая каша.

Кастусёк расчыніў весніцы, выпускціў з двара, як у той палескай вёсцы кажуць, свой тавар. Аж клікнула матка і сказала:
-На небе пачало мурзацца. Ці не дождж збіраецца. Вазьмі, сынку, накінь на плячо світку.

І Кастусёк вярнуўся на вуліцу ў накінутай наапашкі свтітцы з дзвюмя нашытымі зверху кішэнямі. Выгнаў на вуліцу свій тавар і сусед. Стоячы на месцы, за частаколам, ціха (мабыць, каб чуў толькі Кастусь) сусед сказаў:

-Сваіх няма, то маіх вазьмі ў кішэні. Яны ў цябе як торбы.

І кінуў адзін яблык. Ён апісаў над Кастуськом дугу—пералёт—і мякка ўпаў на пясок. Паляцеў другі яблык. Хлопец не варухнуўся. Сусед кінуў трэці яблык у тую секунду, калі пастушок ступіў з месца.



10 год назад чалавек нават не думаў, што зноў хоць калі-небудзь прыйдзе сюды. Ён пакідаў тады дом, каб больш ніколі не вярнуцца. Сям'я здавалася яму непатрэбнай, лішняй… І не змог– вярнуўся… Чаму? Што прыгнала яго сюды зноў? Адчуванне блізкай адзінокай старасці, бацькоўскае сумленне, якое прачнулася і нарэшце загаварыла? Хто ведае што? І вось ён тут, каля свайго дома. Пераступі парог—і перад табою твае дзеці, твая жонка… Парог!.. Але ці захочуць яны, дзеці, лічыць яго цяпер сваім бацькам, ці захоча жонка жыць з ім як мужам?

Між тым у хаце павячэралі. Жанчына пайшла слаць пасцелі.

Пагасла святло.

А чалавек усё стаяў і стаяў…

Потым ён асцярожна, падоўгу спыняючыся каля кожнага дрэва, абышоў сад, пастаяў ля хлява, паслухаў, як мерна і нудна жуе жвачку карова, патузаў рукою плот.

«Новы… Хто паставіў яго?..»

Вуха раптам улавіла шэпт. Чалавек замёр.. Шапталіся каля веснічак на вуліцы двое: хлопец і дзяўчына. Дзявочы голас здаўся яму вельмі знаёмы..

«Дачка…. Няўжо дачка?.. Вырасла, знаецца ўжо з хлопцамі… Каторая—Люда ці Жэня?..»

Лагодны, замілаваны шэпт хлопца, ціхі, стоены дзявочы смех так расчулілі чалавека, што ён заплакаў, заплакаў, як плачуць толькі мужчыны: скупа, горка.

Яшчэ трохі спагадзя ён убачыў, як яна, яго дачка, рослая, стройная, лёгка ішла ў хату. Чалавек падаўся целам наперад, але так і не зварушыўся з месца—застыў. Ён баяўся сустрэцца са сваёй дачкой...

Ходзячы раніцою па садзе, гаспадыня ўбачыла на градах пад яблынямі, на прызбе каля акон, ля хлява і ля плота сляды вялікіх мужчынскіх бот. Яна доўга думала, хто б гэта мог быць? Можа, нехта хацеў абабраць сад? **Барыс Сачанка**

## Сляды

Пастушок

Кастусёк зімою хадзіў у школу. Канец вясны

Чалавека нешта непакоіла. Ён то сядзеў воддаль ад дарогі, прыхінуўшыся да камля дуба, то ляжаў, падклаўшы пад галаву пацёрты рэчавы мяшок, то, уцягнуўшы ў плечы доўгую шыю, хадзіў сюды-туды па ўскрайку леса і не-не дый паглядваў на вёску, што відна была за дробным бярэзнікам на пагорку. Часам позірк яго спыняўся на звітым з сухой травы і валосся гняздзечку, якое пагойдвалася на галінцы кашлатай хваінкі. Гняздзечка ажывала, калі прылятала шустрая шэрая птушачка. Тады з яго высоўвалі галоўкі маленькія, амаль голыя птушаняты. Яны высока выцягвалі худыя шыйкі, наперабой ціліўкалі і голымі кволымі дзюбкамі хапалі прынесены корм. Чалавек у момант хмурнеў, браўся аберуч за галаву і падоўгу не варушыўся. Пасля, схамянуўшыся, выпроствaў плечы, ускідваў пекамечаны мяшок. Але нешта кожны раз стрымлівала яго—ісці ў вёску ён чамусьці не рашаўся…

Толькі калі шэрань надвячорка зацягнула далячынь і стала зусім цёмна, чалавек выкіраваўся на дарогу і, насцярожана ловячы шорахі, аглядаючыся раз-пораз, паволі пакрочыў у вёску.

Каля хаты з чаратовым дахам, які, нібы шапка-кучомка, ссунуўся набок, ён спыніўся. Зладзеявата агледзеўся, зазірнуў праз шчыліну ў варотах у двор і, упэўнішыся, што ніхто не бачыць, пералез цераз нізкі дашчаты плот. Ступіў некалькі крокаў і спыніўся пад яблыняй, трошкі ўбаку ад святла, што падала з незавешенага акна…

У хаце вячэралі. Пажылая жанчына стаяла каля засланага белым абрусам стала, налівала ў конаўку з вялікага гладыша малако. Да конаўкі цягнулася малая, амаль што дзіцячая рука. ..

Чалавек уздрыгнуў, твар яго перасмыкнуўся, нібы ад болю. Прыгнуўшыся, каб не зачапіцца галавой за голле, ён асцярожна падкраўся да акна, прынік да сцяны. Але таго, каго яму хацелася ўбачыць, - не ўбачыў: засланяў вушак…



Оглавление

У пяску сярод вуліцы ляжалі тры спелыя, з чырвонымі і жоўтымі бакамі яблыкі. Кастусёк спакойна, быццам не бачачы тых яблыкаў, ішоў за статкам на выган. Ні разу не азірнуўся, не глянуў набок.

Сусед пастаяў крышку, сам сабе нешта сказаў і, угнуўшыся, знік.

Гэта, як і ўсё, што робіцца ў вёсцы, убачылі, заўважылі суседзі. Каля лаўкі, амаль насупраць Кастусёвай хаты, сустрэліся і спыніліся дзве маладзіцы з вёдрамі, да іх падышоў Яўмен. Тая, што ўжо набрала вады ў студні, расказала, як сусед шпурляў хлопцу яблыкі.

-І я, маладзіца, бачыў. З вузел хлапчук ьой. Трынаццаць гадкоў хлапчуку. А й не паварухнуўся. Бач як!

Вечарам, ля вогнішча на начлезе, Яўмен прыгадваў, разважаў, ацэньваў…

-З гонарам, браце. Кніжак, мабыць, начытаўся. А мо прадзедава кроў азвалася? Прадзед, кажуць, з Кастусём Каліноўскім знаўся… Чалавек! Чалавек расце.

**Фёдар Янкоўскі**

## Тройчы забіты

Яго прасілі:

-Вырві карані свае з зямлі гэтай, ідзі за намі. Толькі ў нас цябе чакае багацце.

Не вырваў. Не пайшоў. Не захацеў багацця таго. І яго забілі.

Яму прапаноўвалі:

-Адачыся веры свае., прымі нашу. Толькі сярод нас цябе чакае слава.

Не адрокся. Не прыняў. Не захацеў славы тае. І яго забілі.

Яму загадвалі:

- Забудзь матчыну мову, назаўсёды пакінь народ свій. Толькі ў нас ты адчуеш сябе шчаслівым.

Не забыў.Не пакінуў. Не захацеў шчасця таго. І яго забілі.

...Тройчы забіты, ён застаўся навечна СЫНАМ зямлі сваёй.

**Яраслаў Пархута**

**Дарожны рэквіем**

Спачатку грэбля ў балоцістым лесе. Зусім нечаканы і пералётны сонечны дожджык. Потым лясное возера.

Спыняемся і выходзім з «газіка».

З нізкай хмарай вялікая роўнядзьвады цёпла павязана леным , рэдкім церушэннем. Сітнёг. Лазняк. Шчэбет птушак і зумканне камароў.

Гром пракаціўся па небе. Як заўсёды, з нейкім трывожным, палахліва-радасным абяцаннем чагосьці лепшага. Знаёмая, з маленства любімая музыка.

Няўжо тут было таксама і тады, у дні вялікай фашысцкай блакады?

Такая краса—і забойства дзяцей?

***

Старая студня з выпетраным жураўлём. Адна на зялёным прасторы. Не менш сіратлівая груша.. Сівы палын на котлішчах.

І яшчэ адзін помнік. Дзвесце семдзесят чалавек. У студзені сорак трэцяга года.

Бярозавы хмызняк на месцы хаты, у якой палілі вёску.

Цяпер тут калгасны выпас, цялятнік з двума громаадводамі і хатка.

Дзеда-вартаўніка, былога партызана, у якога тут забілі жонку і двое дзяцей, засталі мы на выпражаным возе. Спаў на сонцы, а каля кола стаяла пустая бутэлька з імпартнай этыкеткай. Зайшлі з ім у хату, паставілі на стале магнітафон. Але сабака, які дагтуль брахаў на нас з-пад падрубы, цяпер уядаўся пад звонкай падлогай… Прыйшлося пайсці ў машыну, нават ад'ехацца далей ад брэху.

Дзед у *той дзень* брыбег з лесу *пасля. Работа была «чыстая»: усе пабіты, усе пагарэлі.*

*А навокал пажарышча ляжалі акрываўленыя вілы. Адзінаццаць штук. Віламі трупы, а каго і жывога яшчэ, пакідалі ў агонь…*

Едзем.

Дзе было поле—цяпер вялізная паляна цімафееўкі. Жывому трэба жыць. І клопат адчуваецца: парнасць, зноў будзе непатрэбны дождж.

Вялікія лужыны на сонечнай дарозе. Адна за адной. І вясёлая плісачка. Садзіцца каля вады, зноў уцякае ад машыны, зноў садзіцца… Як дзіцячая гульня.

***

Зялёны востраў у няспелым жытнім моры. Бярозы.

З дарогі туды, у жыце, дарожка. Густая, нетаптаная трава. Абапал дэкарратыўныя кусты. То васілёк, то маладзенькі колас у траве.

Пад бярозамі помнік. Тут пахаваны адразу дзве невялікія вёскі. Сто сорак чалавек. У ліпені сорак другога.

Навокал—ціхая песня вячэрняга сонца, пяшчотнага калосся, непрыкметных жаўранкаў.

**Янка Брыль**

**Маналог пілігрыма**

Не з аднае крыніцы піў жывую ваду. Не на адной ніве чуў жалобу жытняга коласа. Не з аднаго бору—гаю збіраў апошнія птушыныя калыханкі. Напрыканцы дня ў забытых богам і людзьмі вёсачках трывожыў сэрца нялёгкім роздумам пра наш заблытаны свет і адначас радаваўся паданням і былічкам , які апавядалі пра мой шматпакутны народ. І з кожнага падарожжа вяртаўся больш відушчы ды багацейшы душою.

Але нялёгка ісці па знявечанай зямлі. Іншы раз нават боязна збочыць з дарогі, каб адпачыць і наталіць смагу. Боязна дакрануцца да кветкі. Боязна ўзяць ягадзіну. Боязна падняць грыб. Урэшце, боязна дыхаць! Бо ўсё гэта—паветра, грыб, ягадзіна, кветка, вада—робіцца атрутай.

Чорнае крыло Чарнобыля вісіць нада мною, над маёй дарогай—над усёй зямлёю … Узмах таго крыла— і вунь колькі жыццяў на валасінцы. Узмах таго крыла—і вунь колькі кветак не бачаць сонца…

А я іду. І не хачу, каб за наступнай паваротկай скончылася дарога.

**Яраслаў Пархута**